**УДК : 630.3(091)(476) + 630.86(091)(476)**

# НАРЫХТОЎКА ДРАЎНІНЫ І ЛЕСАХІМІЧНЫЯ ПРОМЫСЛЫ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ЛЕСАКАРЫСТАННЯ БЕЛАРУСАЎ (ПЕРШАЯ ТРЭЦЬ XX ст.)

***А.Ю. БАБІЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Вызначаны напрамкі развіцця лесахімічнага і лесанарыхтоўчага промыслаў у гістарычным кантэксце першай траціны XX ст. Характарызуюцца такія традыцыйныя віды лесакарыстання, як лесанарыхтоўка, смалакурэнне, гонка дзёгцю, вывальванне вугалю. Разгледжаны асаблівасці арганізацыі лесахімічнай вытворчасці ў першай трэці XX ст., звернута ўвага на значэнне лесапрамысловай дзейнасці ў гаспадарчым жыцці беларускага сялянства. Паказаны ўплыў сацыяльна-эканамічных і палітычных фактараў на сістэму лесакарыстання беларусаў.*

***Ключавыя словы:*** *этналогія, лесакарыстанне, традыцыі, промысел, драўнінныя рэсурсы, лесахімічныя промыслы, саматужны промысел, прамысловая кааперацыя, арцель,.*

**Уводзіны.** Нарыхтоўка драўніны ўяўляе сабой важнейшую культурную форму лесакарыстання. Паказальна, што тэрмін “лесакарыстанне” працяглы час звязваўся толькі з выкарыстаннем драўніны як асноўнага ляснога рэсурсу, а праславянская форма *lěsъ,* па меркаваннях даследчыкаў, першапачаткова вызначала ’будаўнічы матэрыял’, што генетычна суадносіцца з лацінскім *lignum* ’драўніна, матэрыял’ [1, с. 287–288]. Для традыцыйнай сялянскай гаспадаркі драўніна служыла ўніверсальным прыродным рэсурсам, які выкарыстоўваўся для будоўлі жылля і гаспадарчых пабудоў, уцяплення і асвятлення жылля, вырабу транспартных сродкаў, мэблі, посуду. Для шэрагу промыслаў драўніна была ўнікальным сыравінным рэсурсам, які нельга было замяніць іншымі матэрыяламі. Са спажываннем драўніны былі звязаны лесахімічныя промыслы: выпальванне вугалю, гонка смалы і дзёгцю, вытворчасць паташу. Смала выкарыстоўвалася для прасмолкі рыбацкіх лодак, канатаў, рыбалоўных нератаў; паташ ужываўся ў фармацэўтыцы і кандытарскай вытворчасці, быў неабходны для мыцця воўны, адбельвання і фарбавання тканін, шкларобства і мылаварэння. Дзёгаць прымяняўся ў гарбарстве, пры вырабе сырамятнай скуры, для змазкі калёсных восяў; вугаль – у кавальскай справе і металургіі. Сырацечную сасновую смалу – жывіцу – выкарыстоўвалі ў фармацэўтыцы, з яе выраблялі белы вар для смалення лодак, дратвы, друкарскую фарбу, перапрацоўвалі на каніфоль і шкіпінар.

**Асноўная частка.** Напачатку XX ст. значная колькасць сялянскага насельніцтва займалася сезоннай працай на лесапавале, першаснай апрацоўкай драўніны і перавозам яе да месцаў лесасплаву і чыгуначных станцый. Агульная колькасць сялян, што прымалі ўдзел у лясных промыслах, да гэтага часу прыкметна скарацілася ў параўнанні з тымі ж паказчыкамі канца XIX ст. Разам з тым заробкі іх у грашовым выражэнні павялічыліся ў 2-3 разы [2, с. 466]. Найбольш развітыя лясныя промыслы былі ў Мінскай губерні, дзе імі штогод займаліся 60-80 тыс. работнікаў. У той жа губерні ў передваенныя 1912 і 1913 гг. сумарны гадавы прыбытак наёмных работнікаў у галіне лясных промыслаў перавысіў адпаведны паказчык 1905 г. у 2 разы (табліца).

Табліца. – Стан лясных промыслаў у Мінскай губерні (пачатак XX ст.) [3–9]

| Уліковая дата | 1905 | 1906 | 1908 | 1910 | 1911 | 1912 | 1913 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць занятых рабочых (чал.) | 69 243 | 61 171 | 67 040 | 84 890 | 89 467 | 69 596 | 68 176 |
| Сумарны гадавы прыбытак (руб.) | 1 240 789 | 1 113 036 | 1 250 840 | 1 711 590 | 1 395 290 | 2 632 150 | 2 716 249 |

Напачатку XX ст. драўніну з Мінскай губерні адпраўлялі чыгункай у Прусію, Рыгу, Варшаву, Лібаву, Вільню і Херсон, сплаўлялі па Прыпяці і Нёмане на Мемель, па Прыпяці, Дняпру і Бярэзіне – у Кіеў, Паўднёвую і Паўднёва-Заходнюю часткі Расіі [10, с. 113–114; 11, с. 63].

Значная частка сялян выраблялa лясныя матэрыялы – брусы, шпалы, кроквы, бандарную клёпку, абады да колаў, санныя палазы. Паводле ўспамінаў М. Ганчарыка, напачатку XX ст. у яго роднай вёсцы Клянік Ігуменскага павета Мінскай губерні сяляне займаліся калёсным і санным промыслам. У многіх дварах мелася парня для вырабу абадоў, палазоў ці дугаў. Гатовыя вырабы вазілі прадаваць на кірмаш у Мінск [12, с. 16–17].

Парода дрэва мела непасрэдную сувязь з далейшым прызначэннем вырабаў. Беларускія бондары ўлічвалі розныя механічныя і хімічныя ўласцівасці драўніны: цвёрдасць, трываласць, пластычнасць,

устойлівасць да разбурэння, здольнасць вытрымліваць рэакцыі браджэння і перадаваць спецыфічны арамат прадуктам, якія захоўваюцца ў бондарным вырабе [13, с. 78]. У залежнасці ад віду (пароды) і якасці дрэва вызначалася яго далейшае выкарыстанне. З дуба рабілі аснову для фундамента хаты; клёпкі і днішчы, прызначаныя для бондарнага посуду; калодзежныя зрубы; дэталі воза (восі, ручкі, спіцы ў колы, пярэчкі ў драбіны і інш.); калы для платоў і жэрдак; зубы для бараны і інш. Бяроза выкарыстоўвалася для вырабу насілак (шасты для нашэння коп сена), лапат для гумна, апраў (ложа) для стрэльбы, верацён, абвязкі на вуллі і борці на зіму, асобных частак павозкі (калодкі, аглоблі) і інш. Галоўнымі вырабамі з ясеню былі абады для колаў і палазы для саней [14, с. 161, 163–164]. Дрэва для калодных вулляў, якія рабілі пераважна са смалістых і зрэдку з іншых парод, маглі спецыяльна ссушваць, дзеля чаго знізу вакол ствала здымалі кару [15, с. 428].

Да пачатку XX ст. выраб смалы, дзёгцю, вугалю значна скараціўся ў сувязі з заменай сасновай смалы і дзёгцю змазачнымі масламі з нафты, паташу – содай, драўніннага вугалю – каменным. Вытворчасць паташу спынілася зусім [16, с. 128]. Прадукцыя ішла пераважна на мясцовыя патрэбы. Сыравінай для атрымання лесахімічнай прадукцыі служылі розныя пароды хвойных і ліставых дрэў [17, с. 85]. Смалу выкурвалі з хваёвага асмолу, нарыхтоўка якога была традыцыйным промыслам жыхароў лясных вёсак у веснавую і восеньскую пару. Лепшым лічылі спелы пнёвы асмол з карчоў старых хвой, што праляжалі ў зямлі некалькі гадоў. Выкарыстоўвалі таксама стваловы асмол з ніжняй часткі дрэва і павалу. Прасушаныя карчы расколвалі на кавалкі – асмол (*лучына, лучыва*) – даўжынёй каля 1 м [16, с. 129].

Найбольш старажытны – ямны альбо майданны спосаб смалакурэння – існаваў на Беларусі да канца XIX ст. У XX ст. майданы канчаткова былі выцеснены. На змену ім прыйшлі спачатку цагляныя печы, пазней – печы з жалезным катлом, і нарэшце – рэтортная ўстаноўка (з вялікім вертыкальным цыліндрычным катлом). І цагляныя печы, і печы з жалезным катлом, і рэторты дазвалялі выбляць не толькі смалу, але і шкіпінар ды вугаль. А.А. Дзеверагін характарызуе Заходні раён Расійскай імперыі, які ўключаў і беларускія губерні, як *важны цэнтр смалакурэння* да Першай сусветнай вайны [18, с. 12]. Найбольшая частка шкіпінару, які выбляўся ў беларускіх губернях напачатку стагоддзя, прызначалася на экспарт у Германію, Англію і іншыя краіны, у той час як смала рэалізоўвалася пераважна на ўнутраным рынку.

Гонка дзёгцю з берасты ажыццяўлялася некалькімі спосабамі: у ямах-майданах, кучах (вогнішчах), вялікіх гліняных гаршках. Апошні спосаб апісаў І.А. Сербаў. Прыстасаванне ўяўляла сабой печ з гліны і цэглы (“гаршок”) вышынёй 3 ¼, дыяметрам 2 ½ аршына, па абодвух баках якога размяшчаліся кажухі з люхтамі. У гаршку спераду, уверсе і ўнізе рабіліся невялікія акенцы, а ўнутры ад падлогі праходзіла труба праз пласт зямлі ў прыямак, дзе стаяла карыта для дзёгцю. Смалавыя сухія карчы праз акенцы накладвалі ў гаршок да верху. Калі печ такім чынам была насаджана, вокны закладаліся цаглінамі і шчыльна замазваліся глінай. У кажухах разводзіўся моцны агонь. Смала ў чыгунах тлела, і дзёгаць па трубе ішоў наўпрост у карыта [19, с. 16].

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя падзеі, якія адбываліся на Беларусі ў першыя дзесяцігоддзі XX ст., прывялі да значнага памяншэння лясных рэсурсаў краю. У 1920-я гг. у БССР ажыццяўляецца шэраг мерапрыемстваў па ўліку лясоў. Гэта было абумоўлена імкненнем дзяржаўнага кіраўніцтва ўпарадкаваць сістэму лясной гаспадаркі для далейшай інтэнсіўнай распрацоўкі, а таксама захавання і аднаўлення ляснога фонду. Праведзеныя мерапрыемствы выявілі значнае скарачэнне лясных масіваў. З 1914 па 1923 г. плошча лясоў на тэрыторыі БССР у межах 1921 г. (Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, часткова Мінскі і Слуцкі паветы) скарацілася на 9,2% і складала 1 792 525 дзесяцін (у 1914 г. – 1 974 243 дзесяцін) [20, с. 1–2]. Крытычная сітуацыя з ляснымі ўгоддзямі склалася ў Віцебскай губерні, большасць паветаў якой былі вернуты ў 1924 г. БССР. Згодна з дадзенымі 1927 г., лясістасць Аршанскай і Віцебскай акруг была самай нізкай па рэспубліцы – пакрытыя лесам плошчы складалі адпаведна 16,5% і 14,9% ад іх тэрыторыі [21, с. 6]. У больш спрыяльным становішчы знаходзілася Полацкая акруга, якая разам з Мазырскай і Мінскай уваходзіла ў тройку найбольш багатых лесам частак БССР. Адзначым, што ў 1923–24 гг. толькі з Мазыршчыны было вывезена 5 млн пудоў лясных грузаў чыгункай і 2,5 млн пудоў – па рэках [22, с. 20].

Каб задаволіць патрэбы сялян у драўніне, а таксама дзеля падтрымкі сельскай гаспадаркі ў 1924 г. з агульнага ляснога фонду БССР былі вылучаны і перададзены сялянам у “бестэрміновае і дармавое карыстанне” лясы мясцовага значэння. На 1928 г. плошча лясоў мясцовага значэння складала 516 073 га (альбо 16% лясоў дзяржаўнага значэння) [23, с. 11]. Аднак сельскае насельніцтва, як і раней, адчувала дэфіцыт у драўніне, што прыводзіла да самавольных высечак. Паводле Е.П. Міхасенкі, у лясах мясцовага значэння аб’ёмы самавольна высечанага лесу не саступалі памерам санкцыянаванага штогадовага водпуску драўніны [24, с. 7]. У канцы 1920-х гг. з мэтай паляпшэння арганізацыі лясной гаспадаркі, у прыватнасці ў сферы лесаахова і лесааднаўлення, а таксама для ўпарадкавання сістэмы размеркавання драўнінных рэсурсаў было прынята рашэнне аб перадачы лясоў мясцовага значэння камунам, саўгасам і калгасам у безтэрміновае і бясплатнае карыстанне.

У 1920-я – 1930-я гг. вясковае насельніцтва БССР шукала дадатковых прыбыткаў, у тым ліку і на высечцы, пілаванні, вывазе лесаматэрыялаў. М. Азбукін вызначаў выключную ролю драўнінных лясных

рэсурсаў для Беларусі, з прычыны таго, што лес даваў галоўны прадукт вывазу, базу для фабрычнай прамысловасці, магчымасць для заробкаў сялянству на павале лесу, дастаўцы яго на рум і сплаве [22, с. 20]. Значная колькасць сялян была занята на лесахімічных промыслах: карчавала пні, выпальвала вугаль, здабывала смалу, гнала дзёгаць і шкіпінар. Шмат людзей адпраўлялася на сезонныя заробкі (з глыбокай восені і на працягу зімы) у больш лясныя раёны краіны [25, с.30].

Работнікі адной спецыялізацыі аб'ядноўваліся ў арцелі. Напрыклад, у мястэчку Лагойск Мінскай акругі ў 1928 г. працавала даволі вялікая арцель гантаўшчыкоў (61 чалавек) [26, с. 31]. Кустарнае смалакурэнне мела ў 1920-я гг. у савецкай Беларусі дробнапрамысловую форму. У Бабруйскім раёне дзейнічалі 4 смалакурныя арцелі "Смаласкіп", падпарадкаваныя Белкаапрамсавету (вв. Скачок, Брожа, Гарадзецкая, Казулічы). У мястэчку Асіповічы з 1933 г. дзейнічаў смалакурны завод-арцель "Чырвоны Хімік" (114 чалавек) [27, с. 4–5]. Развіццю прамысловай кааперацыі спрыяў пераход да новай эканамічнай палітыкі і прынянцце ў 1921 г. дэкрэту СНК РСФСР "Аб прамысловай кааперацыі", які вызначыў пачатак перыяду адноснай свабоды дзейнасці кааператыўных арганізацый у савецкай Беларусі. Каапераванне саматужнікаў у галіне лясных і лесахімічных промыслаў матывавалася больш выгоднымі ўмовамі на закупку сыравіны. Згодна з пунктам А Ляснога Кодэкса ў рэдакцыі ад 16 кастрычніка 1924 г., аб'яднаныя ў арцелі саматужнікі, якія ўваходзілі ў сістэму лясной і прамысловай кааперацыі, атрымлівалі патрэбную для іх вытворчасці драўніну па таксавых коштах, на тых жа ўмовах, на якіх яе атрымоўвала мясцовае сельскае насельніцтва [28, с. 143]. У той час як прыватнікі не маглі спадзявацца на падобныя ільготы. У дакуменце 1926 г. Лясным Кіраўніцтвам паведамляецца: *"... смалярам, не аб'еднаўшымся у таварыства, ці арцель саматужнікаў, ніякіх праў на зьніжэньня цэн на смальле і дровы законам не дадзены..."* [29, л. 80].

Развіццё лесахімічных промыслаў геаграфічна абумоўлівалася станам лясістасці і наяўнасцю драўніны патрэбнай якасці. Напрыклад, са змяншэннем лясістасці было звязана слабае развіццё лесахімічнай вытворчасці ў Аршанскай акрузе [30, с. 2].

Савецкім кіраўніцтвам была пастаўлена мэта стварэння замест саматужнай вытворчасці адзінага дзяржаўнага прамысловага сектару народнай гаспадаркі. Ужо ў снежні 1929 г. дзяржаўны сектар складаў 35% усёй вытворчасці смалы і шкіпінару, 55% выраблялі каапераваныя саматужнікі і толькі 10% – прыватнікі. У 1928 г. адпаведна – 6,6%, 32,4% і 61%. Адбывалася паступовае ўзбуйненне лесахімічнай прамысловасці. Напрыклад, у Бабруйскім Хімлесгасе ў 1933 г. працавала 335 чалавек [27, с. 8–9].

У 1920-я – 1930-я гг. на Беларусі мелася каля 370 рэтортных установак з гадавым цыклам работ, якія ўваходзілі ў сістэму Беларускага саюза саматужна-прамысловай кааперацыі. У 1926 – 1927 гг. у Барысаўскім раёне налічвалася 14 смалакурных заводаў і 10 лесапілак пры млынах і сукнавальнях [31, с. 59]. У канцы 1920-х гг. на Беларусі ўзнік новы від лесахімічнай вытворчасці на кааператыўнай аснове – здабыванне сырацечнай смалы – жывіцы, галоўным чынам шляхам падсочкі сасны. У 1929 г. адкрыліся Нававелікцкі каніфольна-экстракцыйны, а ў 1930 г. – Барысаўскі каніфольна-шкіпінарны заводы, дзе з жывіцы выраблялі каніфоль і шкіпінар [27, с. 22–25].

У 1930-я гг. Беларусь з'яўлялася адным з найбольш значных раёнаў смалакурнай вытворчасці ў СССР. Тут здабывалася 30% смалы і 40% шкіпінару ад іх агульнай колькасці па СССР [17, с. 88]. У сувязі з пераходам на планавую эканоміку і курсам на індустрыялізацыю краіны, з канца 1920-х гг. і да 1940-х гг. лесапрамысловы сектар стаў важнай крыніцай сродкаў для набыцця машын і абсталявання. У асобныя гады нарыхтоўкі драўніны ў БССР даходзілі да 25 млн м$^3$/год, а ў сярэднім складалі 18 млн м$^3$ [32, с. 55].

Інтэнсіўныя лесараспрацоўкі адбываліся ў 1920-я – 1930-я гг. у заходняй частцы Беларусі, што ўваходзіла ў склад Польшчы. Паводле статыстычных даных, звыш 50% высечаных у Польшчы лясоў у міжваенны перыяд прыходзілася на Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы [33, с. 14]. Да канца міжваеннага перыяду Палессе заставалася самым лясістым ваяводствам Польскай рэспублікі паводле агульнай плошчы, нягледзячы на сур'ёзнае і пастаяннае змяншэнне лясных абшараў. Адзінкавыя буйныя прамысловыя прадпрыемствы, якія дзейнічалі там у міжваенны перыяд, былі звязаны з дрэваапрацоўкай (фанерныя і запалкавыя фабрыкі). Прадукцыя, што выраблялася на іх, мела вялікае значэнне ў маштабах усёй краіны [34, с. 219]. Замежныя лесапрамыслоўцы набывалі лес на карню і наладжвалі інтэнсіўную лесанарыхтоўку пасродкам пашырэння сеткі вузкакалейных чыгунак (600 км) і лесапільных заводаў. Значныя маштабы лесанарыхтоўчай дзейнасці пацвярджаюць і статыстычныя даныя: за 1919 – 1935 гг. па двум ваяводствам (Навагрудскаму і Палескаму) плошча лясоў скарацілася прыблізна на 316,4 тыс. га [33, с. 14].

У Заходняй Беларусі лясы адыгрывалі важную ролю ў якасці крыніцы дадатковых даходаў, якія атрымлівала сельскае насельніцтва пры іх эксплуатацыі (напрыклад, арганізаваныя высечкі і вываз драўніны). Для жыхароў вёскі значэнне заняткаў, звязаных з лесанарыхтоўкай, падвышалася адносна высокімі заробкамі і тым фактам, што найбольшую інтэнсіўнасць гэтыя работы набывалі ў зручны для вяскоўцаў зімовы час [34, с. 219–220]. На тэрыторыі Заходняй Беларусі была створана даволі дасканалая сістэма кантролю і аховы лясоў ад несанкцыянаванай эксплуатацыі. Пііп Засім у сваім эканамічным і сацыяльным даследаванні в. Шані Пружанскага павета напачатку 1930-х гг. адзначае, што крадзяжы лесу раней былі звычайнай справай, аднак такія злачынствы амаль спыніліся па прычыне суровых пакаранняў [35, с. 417].

Рост узроўню злачыннасці, звязанай з лесакарыстаннем, назіраўся падчас эканамічнага крызісу першай паловы 1930-х гг. У сувязі са змяншэннем у некалькі разоў заробкаў у галіне лесаапрацоўкі вырасла колькасць парушэнняў у гэтай сферы. У міжваенны перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі функцыянавала 44 смалакурні, якія былі абсталяваныя пераважна так званымі “латышскімі” печамі [36, с. 81].

**Заключэнне.** Такім чынам, у ландшафтнай гісторыі Беларусі перыяд першай трэці XX ст. адзначаны істотным змяншэннем лясістасці тэрыторыі. Так, у 1900 і 1922 гг. дадзены паказчык складаў адпаведна 37 і 22% (знізіўся з 1900 па 1914 г. на 4% і з 1914 па 1922 г. – на 11%). Фарміраванне такой неспрыяльнай для прыроднага асяроддзя сітуацыі ў сферы выкарыстання лясных рэсурсаў (у першую чаргу – драўнінных) адбывалася пад уплывам працяглых ваенных дзеянняў, змены улады і нестабільных грамадска-палітычных абставін, раздзялення і ўваходжання частак тэрыторыі Беларусі ў склад розных дзяржаўных утварэнняў. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя падзеі першай трэці XX ст. прывялі да рэарганізацыі (ў савецкай Беларусі) альбо рэканструкцыі (у Заходняй Беларусі) існуючай лесагаспадарчай сістэмы. Асноўнымі кірункамі структурнай рэарганізацыі лесагаспадарчага комплексу ў БССР сталі нацыяналізацыя прыродных рэсурсаў і цэнтралізацыя кіравання.

У першай трэці XX ст. лесахімічныя промыслы (смалакурэнне, гонка дзёгцю і шкіпінару, выпальванне вугалю) захоўваліся пераважна ў форме саматужнага промыслу. Эканамічныя пераўтварэнні перыду НЭПа спрыялі развіццю дробнапрамысловай кааперацыі ў галіне лесахімічных промыслаў. Канец 1920-х гг. азначыў пераход на шлях фарміравання ў БССР адзінага дзяржаўнага лесапрамысловага комплексу і паступовага ўзбуйнення лесахімічнай прамысловасці.

Нарыхтоўка драўніны і лесахімічныя промыслы з’яўляліся важнай крыніцай прыбытку для беларускага насельніцтва і дазвалялі часткова альбо цалкам кампенсаваць дэфіцыт бюджэту сялянскай сям’і. Сялянскае насельніцтва займалася сезоннай працай на лесапавале, першаснай апрацоўкай драўніны і перавозам яе да месцаў лесасплаву і чыгуначных станцый, карчавала пні, выпальвала вугаль, здабывала смалу, гнала дзёгаць і шкіпінар. Несанкцыянаваныя вырубкі лясоў беларускімі сялянамі найчасцей былі абумоўлены аб’ектыўнай патрэбай у драўніне, а таксама імкненнем пашыраць свае сельскагаспадарчыя ўгоддзі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск : Навука і тэхніка. – Т. 5: К-Л / Уклад. В.У. Мартынаў, І.І. Лучыц-Федарэц ; рэд. В.У. Мартынаў. – 1978. – 320 с.
2. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. – Мінск : Беларуская навука. – Т. 2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы1861 да сакавіка 1917 г. / З.Е. Абергауз [і інш.] ; пад рэд. В.П. Панюціча. – 2002. – 552 с.
3. Памятная книжка Минской губернии на 1907 год. – 1906. – 200, 207, [3] с.
4. Памятная книжка Минской губернии на 1908 год. – 1907. – 200, 163, [3]с.
5. Памятная книжка Минской губернии на 1910 год. – 1909. – 192, 187, III с.
6. Памятная книжка Минской губернии на 1912 год. – 1911. – 224, 211, III с.
7. Памятная книжка Минской губернии на 1913 год. – 1912. – [532 с.]
8. Памятная книжка Минской губернии на 1914 год. – 1913. – 240, 189, III с.
9. Памятная книжка Минской губернии на 1915 год. – 1914. – 232, 185, III с.
10. Памятная книжка Минской губернии на 1902 год. – 1901. – 218, 208 с.
11. Памятная книжка Минской губернии на 1911 год. – 1910. – 224, 138, II с.
12. Ганчарык, М.М. Шлях ад пачатку стагоддзя: Успаміны / М.М. Ганчарык. – Мінск : ННАЦ імя Ф.Скарыны, 2003. – 290 с.
13. Титов, В.С. Народные деревообрабатывающие промыслы Белоруссии (1917–1941). Этнографические очерки бондарного промысла и изготовления транспортных средств / В.С. Титов. – Минск : Наука и техника, 1976. – 135 с.
14. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч.– Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 670 с.
15. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности : (этнографические данные): с географическим видом Витебской губернии и четырьмя чертежами в тексте / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губ. тип., 1895. – 552 с.
16. Беларусы : у 8 т. – Мінск : Навука і тэхніка. – Т. 1: Прамысловыя і рамесныя заняткі / рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, В.С. Цітоў. – 1995. – 351 с.
17. Промыслы і рамёствы Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.] ; рэдкал.: В.К. Бандарчык, В.І. Мялешка, М.Ф. Піліпенка / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 190 с.
18. Деверягин, А.А. Очерк смолокурения и сухой перегонки в России до войны / А.А. Деверягин. – М. : Высш. сов. нар. хоз., 1918. – 91 с.
19. Сербов, И.А. Поездки по Полесью 1911 и 1912 года / И.А. Сербов. – Вильна : Сев.-Зап. Отд. Императ. русс. географ. общ-ва, 1914. – 51 с.
20. Седашев, Я.Н. Лесное хозяйство в Белорусской Советской Социалистической Республике / Я.Н. Седшев. – Минск : Нар.ком.землед. ССРБ, 1923. – 15 с.
21. Седашев, Я.Н. Богата ли Белоруссия лесом? / Я.Н. Седашев. – Гомель : Тип. «Полеспечать», 1928. – 16 с.
22. Азбукін, М. Мазырская акруга / М. Азбукін // Наш край: штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Інбелкульце. – 1928. – № 8(35) – 9(36). – С. 4–21.

23. Міхасенка, Е.П. Лясы мясцовага значэння на Беларусі і карыстанне імі / Е.П. Міхасенка. – Мінск : Белдзяржвыд, 1929. – 34 с.
24. Міхасенка, Е.П. Лясы ў калгасах / Е.П. Міхасенка. – Мінск : Белдзяржвыд, 1930. – 40 с.
25. Кулакоў, Т.П. Эканамічны стан Азарыцкага раёну, Мазырскай Акругі / Наш край: штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Інбелкульце. – 1929. – № 5(44). – С. 28–36.
26. Самцэвіч, В. Мястэчка Лагойск (Менскай акругі) / В. Самцэвіч // Наш край: штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Інбелкульце. – 1928. – № 4 (31). – С. 25–32.
27. Спіс прамысловых прадпрыемстваў БССР / Кіраўн. нар.-гасп. учота БССР. – Гомель : Палесдрук, 1935. – Вып. 1. – 541 с.
28. Квятковский, М. Кустарная деревообделочная промышленность / М. Квятковский // Кустарная промышленность СССР : сб. ст. и материалов. / Пром.-экон. Совет ВСНХ СССР ; под ред. С.П.Середы.– М. : Изд-е Цент. Управ-я Печати ВСНХ СССР, 1925. – Вып. 1. – С. 132–144.
29. Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Ф. 288. Оп. 1. Д. 4.
30. Кустарная промышленность : материалы к IX Пленуму Оршанского окружного исполнительного комитета / Орш. окруж. план. комиссия. – Орша : Изд-во Орш. окруж. испол. ком., 1927. – 16 с.
31. Самцэвіч, В. Нарыс эканамічнага становішча Барысаўскага раёну / В. Самцэвіч // Наш край: штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Інбелкульце. – 1927. – № 6(21) – 7(22). – С. 53–59.
32. Багинский, В.Ф. Состояние и перспективы лесопользования в Республике Беларусь / В.Ф. Багинский // Науковий вісник. – 2004. – Вип. 14.5.–1. Лісознавство, лісівництво, лісова наука і освіта. – С. 54–57.
33. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919 – 1939 гг.) / Б.Е. Кухарев ; под ред. И.Н. Шемякина. – Минск : Выш.шк., 1975. – 112 с.
34. Ціхарцкі, П. З гісторыі “вялікай дэпрэсіі” на Палессі: эканамічны крызіс першай паловы 1930-х гг. у Палескім ваяводстве і спробы яго пераадолення / П. Ціхарскі // ARCHE Пачатак. – 2013. – № 4. – С. 211–229.
35. Засім, П. Шані, вёска Пружанскага павета. Эканамічнае і сацыяльнае даследаванне / П. Засім // ARCHE Пачатак. – 2013. – № 4. – С. 359–419.
36. Mironowicz, E. Bilorus / E. Mironowicz. – Warszawa : TRIO, 1999. – 298 s.

*Паступіў 09.12.2020*

## TIMBER CUTTING AND WOOD CHEMICAL CRAFT IN THE TRADITIONAL FOREST MANAGEMENT CULTURE OF BELARUSIANS (FIRST THIRD OF THE 20TH CENTURY)

***A. BABICH***

*The article defines the directions for the development of wood-chemical crafts and logging in the historical context of the first third of the 20th century. Such traditional types of forest use are characterized as logging, distillation of wood resin, race of tar, charring. The features of the organization of wood-chemical production in the first third of the XX century are considered. Attention is drawn to the importance of forestry activities in the economic life of the Belarusian peasantry. The influence of socio-economic and political factors on the forest management system of the Belarusians is shown.*

***Keywords:*** *ethnology, forest management culture, traditions, crafts, wood-chemical crafts, logging, distillation of wood resin, race of tar, charring, wood harvesting, artel.*